КУДЫ ПАДАЦЦА АДЗІНОКАМУ СТАРОМУ 4

«МІСІС СВЕТУ» — ФОРУМ ДЛЯ ЗАМУЖНІХ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

20 ЛІСТАПАДА 2018 г. АЎТОРАК № 223 (28839)

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір КАЛТОВІЧ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:

«Прадпрыемствамі ўсіх формаў уласнасці павінны быць прыняты меры па недапушчэнні далейшага росту цэн на мяса і мясапрадукты. Акрамя таго, трэба разгледзець магчымыя меры, якія неабходна прыняць аблвыканкамам, Мінсельгасхарчу, гандлёвым прадпрыемствам па недапушчэнні росту цэн адносна тых, што склаліся на 15 лістапада. Разам з тым МАРГ працягне маніторынг, і пры невыкананні такой дамоўленасці будзе вынесена пастанова аб устанаўленні цэнавага рэгулявання. Цэны на мяса і мясапрадукты павысіліся ў вытворцаў, у перапрацоўшчыкаў. У верасні гандлёвыя надбаўкі на мяса і мясапрадукты склаліся на ўзроўні 15 %, па свініне — 12 %, па ялавічыне — 17 %. Перш чым прымаць рашэнні па цэнавым рэгуляванні, неабходна разабрацца ў прычынах».

КОРАТКА

- **Рознічны тавараабарот у краіне ў студзені — кастрычніку вырас на 8,9 %.**
- «Вялікі гістарычны атлас Беларусі», які ствараўся больш за 10 гадоў, прэзентуюць 21 лістапада ў Нацыянальнай бібліятэцы.
- **Гандаль Мінска плануе прадаць больш за 2,7 млн бутэлек шампанскага і пеністых вінаў да навагодніх свят.**
- У Гомельскай вобласці ў студзені — кастрычніку за кіраванне аўтатранспартам без пройдзенага тэхагляду было аштрафавана больш за 54 тыс. кіроўцаў.

РУХ НАПЕРАД

Фота БелТА.

Візіт Ільхама Аліева — новы крок да выбудоўвання адносін

Такое меркаванне выказаў Аляксандр Лукашэнка падчас афіцыйных перагавораў з Прэзідэнтам Азербайджанскай Рэспублікі.

Усе дамоўленасці выконваюцца

Спачатку прэзідэнты сустрэліся ў фармаце «сам-насам».

«Беларусь вас чакала, — адзначыў беларускі лідар. — Было вельмі шмат інфармацыі аб афіцыйным візіце. Прытым прычыны для гэтага былі розныя, часам фэйкавыя. Хоць гэта таксама вынік. Нават негатыўная інфармацыя, якая не адпавядае рэчаіснасці, таксама часам станоўчая. Таму шчырая была цікавасць да вашага візіту, мы даўно чакалі яго, вельмі шмат гаварылі пра Азербайджан».

Беларускі лідар дадаў, што беларусы ўспрымаюць Азербайджан як вельмі дружалюбную брацкую рэспубліку, з якой у нашай краіны ўстанавіліся добрыя адносіны — і паміж прэзідэнтамі, і ў міжурадавай камісіі, і ў эканоміцы. «Дастаткова сказаць, што за апошні год амаль у 3,5 раза вырас наш гандаль. І пры тым хачу вам чарговы раз пацвердзіць і запэўніць, што закрытых тэм ніколі ў нашых адносінах не будзе», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў свой час бакі жылі ў адной дзяржаве, таму людзі мы вельмі блізкія. Хочацца гэтага ці не, карані сыходзяць у савецкі перыяд. Прэзідэнт выказаў меркаванне, што і шмат пакаленняў таму нашы суайчыннікі мелі добрыя ўзаемаадносіны.

Беларускі лідар дадаў, што ў шматлікіх сферах у нас маюцца дасягненні, аднак ёсць да чаго імкнуцца і што дадаваць. «Упэўнены, што ваш візіт у Беларусь сёння будзе новым крокам да выбудоўвання нашых адносін на перспектыву», — падкрэсліў ён.

СТАР. 2

СТАРТ ДАДЗЕНЫ!

УЧОРА вечарам у выставачным цэнтры «БелЭкспа» афіцыйна распачаўся конкурсны еўратыдзень, старт якому далі старшыня Белтэлерадыёкампаніі Іван Эйсмант і выканаўчы прадзюсар «Еўрабачання» Ян Ола Санд.

Канкурсанты і дэлегацыі з 20 краін-удзельніц шпацыравалі па чырвонай дарожцы, фатаграфаваліся на памяць у адмысловых фотазонах і па просьбе вядучых цырымоніі загадвалі жаданні, самае актуальнае з якіх на найбліжэйшы час — безумоўна, выйграць дзіцячае «Еўрабачанне».

Наша краіна, нагадаем, ужо рабіла гэта двойчы: у 2005 годзе перамогу прывезла Ксенія Сітнік, у 2007-м — Аляксей Жыгалковіч. Акрамя таго, яшчэ тройчы (у 2006, 2011 і 2013 гадах) беларусы ўваходзілі ў топ-3 найлепшых юных выканаўцаў. Тры перамогі на дзіцячым конкурсе ў Грузіі, па дзве — на рахунку Мальты і Расіі (якраз летась расіянка Паліна Багусевіч прынесла сваёй краіне другое «золата» конкурсу). А каму пашанцуе сёлета? Даведаемся ўжо ў нядзелю, 25 лістапада. Сёння ж у канкурсантаў пачынаюцца рэпетыцыі на сцэне «Мінск-Арэны», а паралельна — насычаная праграма знаёмства з краінай, з беларускімі традыцыямі і сучаснасцю. Беларусь выступіць пад нумарам 8, першы нумар дастаўся Украіне, а закрываць шоу выпала Польшчы.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Знаёмцеся!

У «СЛАВЯНСКАГА БАЗАРУ» НОВЫ ДЫРЭКТАР

З новым генеральным дырэктарам Цэнтра культуры «Віцебск» (а па традыцыі той, хто займае гэтую пасаду, узначальвае фэст «Славянскі базар у Віцебску») карэспандэнт «Звязды» пагутарыў на 13-ы дзень яго працы. Сустрэліся з Глебам ЛАПІЦКІМ 13 лістапада. Але ж у адмоўны ўплыў «нешчаслівых» лічбаў ён не верыць. Цікава, дарэчы, што нарадзіўся мой суразмоўнік 29 лютага і да гэтага таксама ставіцца з гумарам. «Звязда» стала першай газетай, якой ён даў інтэрв'ю.

СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!